ТРЭЦІ ЭТАП XXXVII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2021 г.*

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*

**10 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.** Вы, напэўна, ведаеце пра гукаперамальныя словы, якія імітуюць гукі жывой і нежывой прыроды. Суаднясіце выявы жывёл і насякомых з гукаперайманнямі, карыстаючыся словамі для даведак, і запоўніце табліцу. Улічыце, што ў пераліку могуць быць лішнія словы.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Узор:*

| **Малюнак** | **Дзеяслоў-гукаперайманне** | **Дзеяслоў у форме 3-й асобы адз. ліку** |
|---|---|---|
| сабака  | брахаць | брэша |

***Для даведкі:*** бляяць, вуркатаць, гаўкаць, гудзець, крумкаць, кукаваць, кукарэкаць, рохкаць, стракацець, сычэць.

**Заданне 2.** Спалучыце часткі фразеалагічных адзінак са слупкоў 1 і 2, каб стварыць адну правільную фразему. Запішыце варыянты, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| **1** | **2** |
|---|---|
| бачыў бог | да (В,в)ялікадня |
| дарагое яечка | нагам (не)спакой |
| (да)спадобы | што не даў сві(н,нн)і рог |
| за дурной галавой | скуру купляць |
| на жывым мядз…ведзі | не ра(с,сс)ячэш |
| пугаю кавадла | прыпасці |

**Заданне 3.** Падкрэсліце чацвёртае лішняе ў адпаведнасці з пазначанымі ў дужках характарыстыкамі. Патлумачце свой адказ.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 4.** Пастаўце прапанаваныя словы ў форму роднага склону.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 5.** Прачытайце сказы з нарыса У. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі словамі і іх сінтаксічнай функцыяй. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў (напрыклад, А1Б2В2Г6Д4Е7). Улічыце, што сінтаксічныя функцыі могуць паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| | |
|---|---|
| А: Раней хату абкружала прызба, цяпер хаты, вядома, ***на фундаментах.*** | 1. Дзейнік. |
| Б: [На Мядзельшчыне] лубіну менш, затое сінія хвалі ***ільноў*** літаральна бясконцыя. | 2. Частка дзейніка. |
| В: Асаблівым поспехам карыстаўся святы ***Юры***, які забівае дракона, і святы ***Мікола*** за сваё сялянскае паходжанне і за тое, што (па беларускай легендзе) аднойчы ўратаваў адзіную кабылку беднага мужыка. | 3. Выказнік. |
| Г: Цяпер сельская гаспадарка пераважна ***механізаваная.*** | 4. Частка выказніка. |
| Д: Ёсць у ***беларуска-польскага мастака*** Фердынанда Рушчыца геніяльная карціна “Зямля”. | 5. Прыдатак. |
| Е: Калі вы – ***дзіця вялікага горада***, вы можаце ўвогуле не мець уяўлення пра першабытныя лясы недзе над Бярозай-ракой. | 6. Дапасаванае азначэнне. |
| | 7. Недапасаванае азначэнне. |

**Заданне 6.** Маладыя журналісты прынеслі ў рэдакцыю газеты некалькі нататак на розную тэматыку. Праз некаторы час рэдактар вярнуў ім матэрыял з указаннем на неабходнасць сур’ёзнай стылістычнай праўкі. Дапамажыце журналістам знайсці і выправіць памылку і патлумачыць яе прычыны або паказаць рэдактару, што памылкі няма (у гэтым выпадку замест тлумачэння напішыце: “памылкі няма”).

***Узор:***

| ***Сказ*** | ***Выпраўлены варыянт*** | ***Тлумачэнне*** |
|---|---|---|
| І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея зноў паўторыцца. | І вось амаль праз 40 гадоў гэта падзея паўторыцца. | *Паўтарыцца* – гэта значыць адбыцца зноў, яшчэ раз, таму ў спалучэнні *зноў паўторыцца* слова *зноў* лішняе. Памылка выклікана выкарыстаннем збыткоўнага слова (плеаназм). |

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| № | *Сказ* |
|---|---|
| 1. | У гэтым сезоне забеспячэнне бяспечных умоў пры вакцынацыі супраць грыпу – вельмі важная задача. |
| 2. | Музычнае свята, якое праходзіць у абласным цэнтры раз на два гады, пастаянна дапаўняюць новыя фарбы. Аднак галоўныя лейтматывы форума застаюцца нязменныя. |
| 3. | Наша дапамога – толькі сціплая падзяка медыцынскім работнікам за іх самааддануую працу. |
| 4. | Намеснік старшыні прыводзіць некалькі цікаўных прыкладаў. |
| 5. | Горад унёс сваю значную лепту ў развіццё кнігадрукавання на беларускіх землях, бо ў XVII стагоддзі тут размяшчалася манастырская друкарня. |
| 6. | Мы гатовы да далейшага цеснага сумеснага супрацоўніцтва. |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Основателем Вильно считается князь Гедимин. Однажды, гласит легенда, он уснул здесь после охоты в лесах, тянущихся вдоль берегов Вилии, и ему приснился сон: будто на горе, возвышающейся у этой реки, стоит железный волк и воет так, как может выть только тысяча волков. Языческие жрецы-вайделоты разгадали ночное видение так: князь построит здесь город, слава о котором прозвучит в мире громче, чем слава тысячи городов.

*(Адам Мальдис. Белорусские сокровища за рубежом)*

**Заданне 8.** Вызначце вершаваны памер, тып рыфмоўкі і троп (сродак мастацкай выразнасці) у вылучаным фрагменце. Адказы запішыце ў табліцу. Памятайце, што вершаваны памер вызначаецца па колькасці стоп у вершаваным радку (напрыклад, 5-стопны ямб).

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| *Вершаваныя радкі* | |
|---|---|
| А | ***Занямелі песні***, стоны…<br>Ціха скрозь, як у магіле!<br>Толькі, выстраіўшы крылле,<br>Глуха каркаюць вароны.<br>*Янка Купала* |
| Б | Разгарэўся, вакол абудзіўшы сялібы,<br>Аганькамі заззяў па ***асветленых*** шыбах.<br>Аганькамі яго саграваліся людзі,<br>І адзін аганёк закаціўся мне ў грудзі.<br>*Пятрусь Броўка* |

| | |
|---|---|
| В | Пазносіў я многа ламачча,<br>Вячэрні касцёр хоць куды!<br>Сусед мой, ***як рыцар з Ламанчы,***<br>Наіўны, высокі, худы.<br>*Пімен Панчанка* |
| Г | Так і сустрэў я сонца ўсход,<br>які ***не бачыў я сто год***.<br>Шчакою, звернутай да ўсходу,<br>адчуў я цёплую лагоду.<br>*Анатоль Вярцінскі* |

**Заданне 9.** Пазнайце творы па рыфмоўцы слоў першых чатырох радкоў. Назавіце твор, аўтара і ўзнавіце гэтыя радкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

А) лебядзінаю – калінаю; чары – ярам
Б) пазаві – любві; травах – ява
В) кустоў – грыміць; салавей – ручэй
Г) вішняў – лёгкі; аганёк – матылёк

**Заданне 10.** Уявіце, што Вы рэпарцёр службы навін. Сфармулюйце два пытанні для Андрэя Беларэцкага – героя аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” Уладзіміра Караткевіча.

Першае пытанне павінна быць па фактах біяграфіі Беларэцкага, якія ён павінен пацвердзіць ці абвергнуць у адпаведнасці з тэкстам аповесці.

Другое пытанне – пра матывы паводзін Беларэцкага ці пра яго пачуцці ў пэўны час, які апісваецца ў творы.

Звярніце ўвагу, што пытанні павінны быць такімі, каб адназначны адказ быў на старонках аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”.

Напрыклад, калі б на інтэрв’ю прыйшоў Машэка з твора Янкі Купалы, то ў яго можна было б спытаць, ці ганяў ён плыты па Волзе і што ён адчуваў у адносінах да Натальлі да яе сустрэчы з панам. Машэка мог бы адказаць: “Не, я ганяў плыты па Дняпры. Я бязмежна кахаў Натальку”

Сфармулявалі пытанні? А цяпер адкажыце на іх ад імя Андрэя Беларэцкага. Пафантазіруйце і адкажыце ад яго імя на трэцяе пытанне, якое сфармулявалі мы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*